ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
10.06.2025 № 103

# Вучэбная праграма
# па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» для III–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» прызначана для III–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 140 гадзін (2 гадзіны на тыдзень).

3. Мэты вучэбнага прадмета:

аваладанне маўленчай і чытацкай дзейнасцю на беларускай мове; азнаямленне з багатым светам беларускай дзіцячай літаратуры як мастацтвам слова, далучэнне да нацыянальных і агульначалавечых духоўных каштоўнасцей падчас чытання і асэнсавання літаратурных твораў;

фарміраванне пісьменнага чытача, які валодае навыкам чытання, культурай маўлення, спосабамі самастойнай работы з тэкстам і дзіцячай кнігай; усведамленне значэння чытання для паспяховага навучання, будучай дзейнасці, самаадукацыі і самаразвіцця на працягу ўсяго жыцця.

4. Для дасягнення гэтых мэт вызначаны і вырашаюцца наступныя задачы:

фарміраваць цікавасць да кніг і чытання, пашыраць чытацкі кругагляд;

развіваць універсальныя вучэбныя дзеянні і спосабы пазнавальнай дзейнасці, якія забяспечваюць паспяховае вывучэнне любога вучэбнага прадмета;

удасканальваць камунікатыўна-маўленчыя ўменні навучэнцаў;

засвойваць чытацкія ўменні, літаратурныя ўяўленні і веды, неабходныя для ўспрыняцця літаратуры як мастацтва слова, разумення твораў, вылучэння, збору, тлумачэння інфармацыі ў навукова-пазнавальных і вучэбных тэкстах;

фарміраваць уяўленні пра аўтараў мастацкіх твораў, іх творчасць;

ажыццяўляць літаратурна-творчую дзейнасць на аснове вывучаемых твораў;

развіваць эмацыянальную чуласць, вобразнасць, крытычнае мысленне і творчую актыўнасць;

фарміраваць сродкамі літаратуры традыцыйныя каштоўнасныя арыенціры, выхоўваць грамадзянскія і духоўна-маральныя якасці асобы.

5. На ўроках літаратурнага чытання выкарыстоўваецца метад жывога слова ў разнастайных формах: гутарка, пераказ, слоўнае маляванне, апісанне ілюстрацый, чытанне на памяць, выразнае чытанне.

Вядучым метадам фарміравання чытацкіх уменняў з’яўляецца аналіз тэксту літаратурнага твора. Аналіз праводзіцца ў форме практычнай работы з тэкстам: акцэнтнае вычытванне ўрыўкаў тэксту з апісаннем учынкаў героя, карцін прыроды, вобразных слоў і выразаў, слоў-носьбітаў характарыстыкі персанажаў, слоў, якія ўказваюць на пачуцці і настрой; пошук адказаў на пытанні педагагічнага работніка; вылучэнне сэнсавых частак, складанне плана.

Для арганізацыі літаратурна-творчай дзейнасці на ўроку выкарыстоўваюцца практычныя метады навучання. Навучэнцам прапаноўваюцца разнастайныя творчыя заданні па змесце прачытанага твора: разыгрыванне дыялогаў, эпізодаў, пастаноўка «жывых карцін» з выкарыстаннем руху, мімікі, жэстаў; чытанне па ролях; харавая дэкламацыя асобных урыўкаў (паўтораў, песень); літаратурныя гульні; мадэляванне вокладкі кнігі.

На ўроках выкарыстоўваецца аналіз эмацыянальнага зместу твора; практыкаванні ў чытанні ўслых дыялогаў, эмацыянальна насычаных урыўкаў тэксту, пошук варыянтаў дакладнай перадачы пачуццяў, настрою, стану герояў; узорнае выразнае чытанне педагагічнага работніка.

Вядучым метадам работы з дзіцячай кнігай на пазакласным чытанні з’яўляецца метад чытання-разгляду.

Працэс навучання літаратурнаму чытанню рэалізуецца праз франтальную форму работы, якую рэкамендуецца спалучаць з калектыўна-размеркавальнай, групавой, парнай і індывідуальнай. Выбар форм і метадаў навучання і выхавання педагагічны работнік ажыццяўляе самастойна ў адпаведнасці з вучэбнымі задачамі канкрэтнага ўрока літаратурнага чытання.

6. Чакаемыя вынікі вывучэння зместу вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» па заканчэнні навучання і выхавання:

6.1. асобасныя: усведамленне нацыянальнай прыналежнасці і спасціжэнне культурнай спадчыны краіны падчас чытання дзіцячай літаратуры; развіццё матываў чытацкай дзейнасці, асабістага сэнсу, рэфлексіі, эстэтычных патрэб і чытацкага густу; засваенне маральных норм і духоўных каштоўнасцей пры навучанні літаратурнаму чытанню;

6.2. метапрадметныя: інтэлектуальна-пазнавальныя (авалоданне лагічнымі дзеяннямі, устанаўленне аналогій, прычынна-выніковых сувязей; вырашэнне праблем літаратурна-творчага і пошукавага характару); інфармацыйна-чытацкія (авалодванне стратэгіямі сэнсавага чытання тэкстаў розных стыляў і жанраў; уменнямі, звязанымі з пошукам, зборам, пераўтварэннем інфармацыі; фармуляванне ўласнага меркавання і яго аргументацыя; уменне рабіць высновы, інтэграваць і інтэрпрэціраваць

інфармацыю); арганізацыйна-рэгулятыўныя (аваладванне ўменнямі прымаць і захоўваць мэты і задачы чытацкай дзейнасці; планаваць, кантраляваць, карэкціраваць і ацэньваць выкананыя дзеянні; знаходзіць эфектыўныя спосабы дасягнення мэты, прагназаваць і ўсведамляць якасць засвоеных ведаў); сацыяльна-камунікатыўныя (выкарыстанне маўленчых сродкаў для вырашэння камунікатыўных і літаратурна-пазнавальных задач; прыняцце розных меркаванняў, неабходных для разумення свету, сябе і іншых людзей);

6.3. прадметныя: уменне чытаць тэкст услых усвядомлена, правільна і выразна; працаваць з тэкстам твора: вызначаць тэму, характарызаваць герояў, ацэньваць іх учынкі, выяўляць аўтарскую пазіцыю, тлумачыць галоўную думку твора, дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі, складаць план, пераказваць твор; ведаць асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці, выкарыстоўваць іх на практыцы; адрозніваць асноўныя элементы і віды кніг; выконваць творчыя работы; карыстацца паслугамі бібліятэкі.

7. Змест вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» складаюць чатыры асноўныя кампаненты:

прадметныя веды (першы кампанент);

прадметныя (чытацкія і камунікатыўна-маўленчыя) і метапрадметныя ўменні (універсальныя вучэбныя дзеянні) (другі кампанент);

вопыт літаратурна-творчай дзейнасці (трэці кампанент);

вопыт эмацыянальна-каштоўнасных адносін (чацвёрты кампанент).

Усе кампаненты зместу вучэбнага прадмета прадстаўлены комплексна і фарміруюцца на аснове ведаў тэкстаў мастацкіх і навукова-пазнавальных твораў.

Прадметныя веды фарміруюцца падчас практычнай работы з тэкстамі твораў вуснай народнай творчасці, класічнай і сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры. Дадзенай вучэбнай праграмай прадугледжана аваладанне прадметнымі (тэарэтыка-літаратурнымі) ведамі на практычным узроўні. Прадметныя веды складаюць літаратурныя ўяўленні навучэнцаў пра віды твораў вуснай народнай творчасці і аўтарскай літаратуры; выяўленча-вобразныя сродкі мовы; сродкі выразнага чытання; сціслыя біяграфічныя звесткі аб жыцці і творчасці дзіцячых пісьменнікаў; прозвішчы пісьменнікаў, назвы і змест найбольш упадабаных твораў; тэксты, рэкамендаваныя для завучвання на памяць.

Чытацкія ўменні складаюцца з уменняў чытаць, працаваць з тэкстам твора і дзіцячай кнігай, якія фарміруюцца ў працэсе аналізу літаратурнага твора і ўяўляюць сабою дзеянні па арыенціроўцы ў тэксце, што звязаны з яго ўспрыняццем, выяўленнем, усведамленнем, ацэнкай зместу і сэнсу.

Чытацкія ўменні, якія маюць універсальны характар, выкарыстоўваюцца падчас работы з тэкстамі розных відаў (вучэбных,

навуковых, навукова-пазнавальных, публіцыстычных) і адносяцца да метапрадметных (інтэлектуальна-пазнавальных, інфармацыйна-чытацкіх, арганізацыйна-рэгулятыўных, сацыяльна-камунікатыўных).

Камунікатыўна-маўленчыя ўменні суправаджаюць чытацкую дзейнасць і выконваюць функцыю чытацкіх уменняў, што рэалізуюцца ў маўленчай форме (у стварэнні звязных вусных выказванняў для перадачы зместу тэксту і зносінамі паміж чытачамі, адборы сродкаў моўнага афармлення выказванняў).

Вопыт літаратурна-творчай дзейнасці набываецца навучэнцамі падчас выканання імі разнастайных творчых заданняў у сувязі з прачытаным творам.

Вопытам эмацыянальна-каштоўнасных стасункаў навучэнцы авалодаюць у працэсе аналізу мастацкага твора, вызначэння аўтарскай пазіцыі, ацэнкі падзей і персанажаў, супастаўлення з асабістым успрыманнем; аргументацыяй уласнай ацэнкі ўчынкаў герояў і падзей, параўнання яе з думкамі аднакласнікаў.

Змест вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)» прадстаўлены раздзеламі «Кола чытання», «Фарміраванне навыку чытання і ўніверсальных вучэбных дзеянняў», «Фарміраванне чытацкіх уменняў і ўніверсальных вучэбных дзеянняў», «Літаратурная прапедэўтыка», «Літаратурна-творчая дзейнасць навучэнцаў», «Пазакласнае чытанне», «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў».

Раздзел «Кола чытання» змяшчае апісанне вучэбнага матэрыялу і рэкамендаваны пералік твораў для чытання і вывучэння ў III–IV класах з указаннем колькасці гадзін на вывучэнне тэм чытання. Рэкамендаваны пералік твораў складаецца з двух спісаў: для чытання і вывучэння ў класе і для пазакласнага чытання.

У раздзеле «Фарміраванне навыку чытання і ўніверсальных вучэбных дзеянняў» пададзены змест работы па фарміраванні чытацкіх уменняў.

Прадугледжана фарміраванне наступных метапрадметных уменняў: чытання як універсальнага вучэбнага ўмення, пастаноўкі вучэбнай задачы чытання, планавання дзейнасці пры падрыхтоўцы да слоўнага малявання, чытання па ролях, выразнага чытання, самаацэнкі чытання).

Раздзел «Фарміраванне чытацкіх уменняў і ўніверсальных вучэбных дзеянняў» змяшчае пералік уменняў, якімі авалодаюць навучэнцы падчас практычнай работы з тэкстамі мастацкіх і навукова-пазнавальных твораў.

У раздзеле «Літаратурная прапедэўтыка» вызначана кола літаратуразнаўчых уяўленняў, якія фарміруюцца ў навучэнцаў у працэсе чытання і аналізу канкрэтных твораў. Навучэнцы назіраюць жанравую разнастайнасць літаратуры, адкрываюць для сябе «законы пабудовы»

скорагаворкі, загадкі, даведваюцца пра асноўныя прыметы казкі, верша, апавядання, назапашваюць уяўленні аб аўтарах твораў і дзіцячых кніг.

Раздзел «Літаратурна-творчая дзейнасць навучэнцаў» уключае пералік відаў самастойнай літаратурна-творчай дзейнасці, творчасці, дзякуючы якім можна выказаць уласныя адносіны, глыбей зразумець і інтэрпрэціраваць твор.

У раздзеле «Пазакласнае чытанне» дадзена характарыстыка вучэбнага матэрыялу, які складае кола чытання навучэнцаў, тэматыка чытання, пададзены патрабаванні да аб’ёму і афармлення дзіцячай кнігі, відаў выдання (зборнік аўтарскі ці тэматычны). Вызначаны віды самастойнай чытацкай дзейнасці, формы індывідуальнай і групавой работы з кнігай у пазаўрочны час, пералік ведаў і ўменняў работы з дзіцячай кнігай.

У раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў» установлены патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў па літаратурным чытанні.

8. Састаўной часткай вучэбнага прадмета з’яўляецца пазакласнае чытанне.

Мэта пазакласнага чытання – знаёмства навучэнцаў з кнігамі з даступнага ім кола чытання; фарміраванне цікавасці да кніг, жаданне і ўменне іх выбіраць і чытаць; навучанне работы з кнігай як з асаблівым аб’ектам.

Навучэнцы авалодваюць ведамі аб элементах кнігі, якія дазваляюць чытачу арыентавацца ў любой кнізе і групе кніг (загаловак, прозвішча аўтара, ілюстрацыя, змест, прадмова), аб сродках арыентацыі ў свеце кніг (кніжная выстава, плакат, рэкамендацыйны спіс, рэкамендацыйны паказчык, картатэка, электронны каталог), аб газетах і часопісах як перыядычных выданнях; аб культуры і гігіене чытання. Навучэнцы набываюць уменне самастойна выбіраць кнігі на прапанаваную тэму, карыстацца арыенціровачным апаратам кнігі, відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі (з прыцягненнем бібліятэкара).

У пазаўрочны час у сістэме пазакласнага чытання павінны практыкавацца літаратурныя ранішнікі, віктарыны, конкурсы чытачоў, работа ў «майстэрні па рамонце кніг». Урокі пазакласнага чытання праводзяцца падчас і пасля вывучэння асноўных тэм чытання і ўваходзяць у агульную колькасць гадзін, адведзеных на вучэбны прадмет. На працягу чарговага адрэзку часу педагагічны работнік кіруе самастойным пазаўрочным чытаннем кніг, газет, часопісаў.

9. Дадзеная вучэбная праграма арыентуе на ажыццяўленне міжпрадметных сувязей з вучэбнымі прадметамі «Русская литература (литературное чтение)», «Выяўленчае мастацтва», «Музыка» падчас

фарміравання ў навучэнцаў уяўленняў: «жанр», «мастацкі вобраз», «задумка аўтара», «тэма», «форма», «змест», «рытм», «настрой», «аўтар».

10. Асноўнымі відамі дзейнасці на ўроках літаратурнага чытання з’яўляюцца чытанне ўслых і пра сябе (моўчкі), выразнае чытанне, чытанне па ролях, вывучаючае чытанне, праглядавае чытанне, выбарачнае чытанне, завучванне на памяць вершаваных твораў; слуханне і апавяданне; пераказ (падрабязны, выбарачны, сціслы) па гатовым плане; апорных словах, ілюстрацыях; творчы пераказ з дапаўненнем сюжэту; уяўлення пра героя, падзеі, паэтычныя карціны прыроды; творчая інтэрпрэтацыя тэксту (слоўнае маляванне асобных эпізодаў, паэтычных карцін, стварэнне слоўных і графічных ілюстрацый да твора); інсцэніроўка эпізодаў мастацкага твора; аналітычная і ацэначная работа з тэкстам твора; складанне выказванняў параўнальнага характару; высноў, асабістых меркаванняў; назіранне за выяўленча-выразнымі сродкамі мастацкага маўлення (адухаўленне, параўнанне, эпітэт, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы); структураванне тэксту ў форме плана, графічнай схемы; чытанне-разгляд дзіцячых кніг; прагназаванне, абмеркаванне, дыскусія.

## ГЛАВА 2

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў III КЛАСЕ АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(70 гадзін, з іх 58 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – праверка навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

### КОЛА ЧЫТАННЯ

### ПРЫГОЖАЯ ПТУШКА ПЕР’ЕМ, А ЧАЛАВЕК ВУЧЭННЕМ

(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка навыкаў чытання)

Для чытання і вывучэння ў класе

Л. Арабей. «Новы сшытак».
Н. Галіноўская. «Дзень добры, школа!».
Н. Гілевіч. «Калі ранец лёгкі і калі цяжкі?».

М. Дукса. «Ці так чытала?».
В. Хомчанка. «Крыўда».
Прыказкі пра адносіны да вучэння.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Грамацеі», «Параска і падказка», «Свята кнігі».
Я. Бяганская. «Цяжкая задача».
М. Гіль. «Першы настаўнік».
А. Дзеружынскі. «Алё, Але», «Балбатуха Міла».
М. Дукса. «Скарга кнігі», «Хітры дзённік».
К. Жук. «Урок».
Янка Купала. «Юрачка».
У. Корбан. «Тры вучні».
В. Лукша. «Тэлефон».
М. Пазнякоў. «Мая бібліятэка».
П. Прануза. «Цяжкая дарожка».
А. Русак. «Мой сябра».
В. Хомчанка. «Коска».
У. Юрэвіч. «Караблік».
А. Якімовіч. «Аб чым спрачаліся кнігі?».

## УВОСЕНЬ І ВЕРАБЕЙ БАГАТЫ
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

П. Броўка. «Надыход восені».
С. Грахоўскі. «Восень».
Р. Ігнаценка. «Лістападнік».
Якуб Колас. «Ясныя дні восені».
Янка Купала. «Лістапад».
П. Панчанка. «У грыбы».
Восеньскія песні.
Народныя загадкі пра восеньскія з’явы прыроды.

Для пазакласнага чытання

І. Багдановіч. «Восень».
А. Бутэвіч. «Прыгоды лісціка-карунчыка».
В. Вітка. «Лістапад».

Вера Вярба. «Гусі клічуць у вырай».
Н. Галіноўская. «Восень у лесе».
У. Дубоўка. «Залатая, асенняя раніца!», «Мядзведзь».
В. Жуковіч. «Адляцелі жураўлі».
Р. Ігнаценка. «Баравікі ў хусцінках», «Грыбнік».
Якуб Колас. «Восень».
П. Макаль. «Асенняе».
І. Навуменка. «Падранены журавель», «Пачыналася восень».
Я. Пушча. «Залатая пара».
Цётка. «Чаму птушкі адлятаюць».
Купальскія песні.

## ЧАЛАВЕК БЕЗ РАДЗІМЫ, ШТО САЛАВЕЙ БЕЗ ПЕСНІ
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

П. Броўка. «Песня хлебу».
У. Караткевіч. «Мая Беларусь».
У. Мяжэвіч. «Цяцерка».
М. Мятліцкі. «На мове роднай».
П. Панчанка. «Песня пра Мінск».
А. Русак. «Мой край».
Прыказкі пра адносіны да Радзімы.

### Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Зямля з блакітнымі вачамі».
А. Бадак. «Маленькі чалавек у вялікім свеце».
Д. Бічэль. «Белая Русь».
П. Глебка. «О Беларусь, мая калыска...».
А. Дзеружынскі. «Я спяваю, ты спявай!», «Прамяніся ярчэй і ярчэй».
В. Жуковіч. «Няма даражэйшай зямлі», «Радзімаю нашай край гэты завецца…».
У. Караткевіч. «Родная зямля».
А. Карлюкевіч. «Рыбнае царства».
У. Карызна. «Наша Беларусь», «Роднае слова».
А. Клышка. «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга» («Зала сарака», «У слаўным горадзе Полацку»).
Якуб Колас. «Родныя вобразы».
Янка Купала. «Сын і маці».

У. Мазго. «Беларуска».
М. Пазнякоў. «У родным краі», «Родныя назвы».
А. Пісьмянкоў. «Цымбалы».
Я. Сіпакоў. «Першы астраном».
Максім Танк. «Лемантар», «Хлеб».
Беларуская народная казка «Жаронцы».
Легенда «Адкуль пайшлі беларусы».
Паданне «Добры Жыцень».
Паданне пра Жыцень.

## ДОБРЫ ЧАЛАВЕК І ЖЫВЁЛУ ШКАДУЕ
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Чаму ў трывозе Дзед Мароз?».
Н. Галіноўская. «Сябры прыроды».
А. Дзеружынскі. «Добрае сэрца».
Якуб Колас. «Ластаўкі».
А. Якімовіч. «Ножык».
Народныя загадкі пра жывёл.

### Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Рэчка, рэчанька».
Л. Арабей. «Мікіткаў сон».
А. Асіпенка. «Прыгожая лісіца».
Змітрок Бядуля. «Скарб».
А. Васілевіч. «Пажар», «Калінавая рукавічка».
Г. Васілеўская. «Як кот грыбы збіраў».
М. Даніленка. «Журка».
А. Дзеружынскі. «Азбука птушак».
У. Дубоўка. «Шануйце ўсё жывое».
М. Дукса. «Сябры».
К. Жук. «Зямныя лекары».
В. Жуковіч. «Слухай родную прыроду».
Якуб Колас. «Савось-распуснік».
У. Мазго. «Лайдак і Шпак».
Г. Марчук. «Добрае сэрца», «Як Агапка мальвы ўратавала».
Р. Няхай. «Белая бярозка».
М. Пазнякоў. «Бярозка».

А. Пальчэўскі. «Верабейчык», «Крыўда», «Экзамен».

Я. Пархута. «І заяц стаў зайцам...», «Лесавічок» (Казка пятая. «Шалястунчыкі». Казка сёмая. «Пацерка». Казка адзінаццатая. «Сараканожка». Казка трынаццатая. «Ластаўчыны дзеткі»).

Г. Пашкоў. «Добрым будзь!».

З. Прыгодзіч. «Выратаванне ластаўкі».

Г. Пшонік. «Каштанчык».

А. Пысін. «Пісьмо птушак».

П. Рунец. «Ліпка».

І. Хадановіч. «Хто жыве на дне ракі?».

В. Хомчанка. «Дзядоўнік».

В. Шырко. «Дзіўны кот».

М. Янчанка. «Яблычак».

Легенды «Адкуль зязюля ўзялася», «Адкуль узяўся мядзведзь».

## ЗІМОВЫ ДЗЯНЁК, ШТО КАМАРОЎ НАСОК
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

Н. Гілевіч. «Снежны дзед».

В. Жуковіч. «Цудоўныя святы».

Якуб Колас. «Зіма» («Надышлі марозы…»).

М. Маляўка. «Белыя ключы».

В. Хомчанка. «Елка з белымі кветкамі».

Калядныя песні.

Народныя прыкметы пра зіму.

### Для пазакласнага чытання

Г. Аўласенка. «Хто як зімуе».

В. Дайліда. «Добрая фея».

М. Даніленка. «Ключы бабулі Зімы», «Зімовая азбука».

В. Жуковіч. «Старажытны звычай», «Зіма», «Першы снег», «Калі прыходзіць Дзед Мароз?».

Янка Журба. «Дзед Мароз».

Р. Ігнаценка. «Ягады пад снегам».

Клаўдзія Каліна. «Люты», «Зімовы дуб».

У. Карызна. «Гуканне Дзеда Мароза», «Навагодняя песенька».

Якуб Колас. «Дзед-госць», «Зіма», «Першы снег».

К. Крапіва. «З Новым годам».

П. Макаль. «Бялее снег пушысты».
У. Мацвеенка. «Ёлка-вясёлка».
А. Русак. «Сінічка».
А. Ставер. «Зіма».
М. Хведаровіч. «Ля хат высокія сумёты».
М. Чарняўскі. «Ёлка», «Ліса-калядоўшчыца».
Масленічныя песні.

## ЯК ТЫ ДА ЛЮДЗЕЙ, ТАК І ЛЮДЗІ ДА ЦЯБЕ
(8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Вельмі «ветлівы» Мікіта».
Л. Арабей. «Добрая фея».
У. Караткевіч. «Жабкі і Чарапаха».
Н. Мацяш. «Залатое сэрца».
П. Прануза. «Сёння ў Толі выхадны».
М. Янчанка. «А таму!».
Прыказкі пра адносіны да людзей.

### Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Ледзянцы».
Г. Аўласенка. «Як мухаморы вайну пачыналі».
А. Бачыла. «Колькі кот набіў пасуды».
Я. Бяганская. «Аленчыны канькі».
Г. Васілеўская. «Усмешка».
А. Дудараў. «Пухнацік».
Е. Лось. «Казка пра Ласку».
У. Мазго. «Света з інтэрнэта».
П. Макаль. «Пакліч у госці сонца».
А. Масла. «Зорачка».
І. Муравейка. «Шкадлівы камень», «Яблыкі для сястрычкі».
А. Пальчэўскі. «Добрае слова».
Т. Сівец. «Вандроўка на Паўночны полюс».
Д. Слаўковіч. «Віншаванне», «Селядцы на градзе».
М. Янчанка. «Адведалі».
Беларуская народная казка «Людзей слухай, а свой розум май».

## ДОБРАЕ ДЗІЦЯ БАЦЬКОЎ ДУМКІ ЗГАДВАЕ

(5 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Г. Аўласенка. «Чыя мама лепшая?».
І. Муравейка. «Лыжкай па лбе».
І. Шамякін. «Пастух».
Беларуская народная казка «Зайздросны дзядзька».
Беларуская народная казка «Недалікатны сын».
Калыханкі, забаўлянкі, пацешкі, прыказкі пра ўзаемаадносіны ў сям’і.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Будзь верным, добрым сынам!».
Л. Арабей. «Мама».
Т. Бунта. «Далонькі з пушынкамі».
А. Васілевіч. «Мая гаспадарка», «Вернісаж».
П. Васючэнка. «Жаласлівая прынцэса».
Алесь Гарун. «Матчыны словы».
М. Даніленка. «Самыя дарагія падарункі».
У. Дубоўка. «Пра дзеда і ўнука».
М. Дукса. «Татава машына».
В. Жуковіч. «Дзіўны горад».
В. Зуёнак. «Смачны сон».
Я. Маўр. «Шчасце».
Л. Рублеўская. «Прыгоды мышкі Пік-Пік» («Як тата стаў супермэнам», «Мышка Пік-Пік робіць сабе макіяж»).
В. Ткачоў. «Дарога».
І. Шамякін. «Хітрунння».
Беларускія народныя казкі «Стралец і рыбак», «Каток – залаты лабок»
Народныя забаўлянкі і лічылкі.

ВЯСЕННІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ
(8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне,
1 гадзіна – праверка навыкаў чытання)

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Багдановіч. «Перад паводкай».
У. Карызна. «Лісце прыляцела».
Якуб Колас. «Вясна».

М. Мятліцкі. «Пытанні».
А. Русак. «Мама».
Фальклорныя творы: вясновыя песні.

Для пазакласнага чытання

А. Бачыла. «Мама».
А. Бялевіч. «Вясёлка над полем».
З. Верас. «Сонейка грэе».
В. Вітка. «Вялікдзень».
Я. Галубовіч. «Не пакінулі ў бядзе», «Салодкі кляновік», «Вясна».
М. Даніленка. «Голас вясны».
В. Жуковіч. «Гуканне вясны».
Клаўдзія Каліна. «Песня вясны».
А. Клышка. «Сыход зімы».
Якуб Колас. «Першы гром», «Краска».
Янка Купала. «Вясна».
М. Маляўка. «Вішнёвае воблачка».
І. Муравейка. «Страшны звер».
П. Прануза. «Ручаёк».
Ю. Свірка. «Свята».
Максім Танк. «Галінка і вярбінка», «Ірынка», «Садзіце лясы!».
М. Хведаровіч. «Ластаўкі», «Пралескі», «Красавік».
К. Цвірка. «Коцікі».
Цётка. «Гутаркі аб птушках».

## ХТО ХОЧА ШЧАСЛІВА ЖЫЦЬ, ТОЙ ПРАЦУ ПАВІНЕН ЛЮБІЦЬ
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Эдзі Агняцвет. «Буду настаўнікам».
І. Аношкін. «Воля-кулінарка».
М. Даніленка. «Маленькі фермер».
З. Марозаў. «Тата ў Ромы – аграном».
І. Муравейка. «Паўлік-будаўнік».
Беларуская народная казка «Лёгкі хлеб».
Прыказкі пра адносіны да працы.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Саўка за сталом».
А. Астрэйка. «Размова аб прафесіях».
Я. Бяганская. «Сланечнікі».
В. Вітка. «Хто што робіць».
В. Гардзей. «Мой тата – трактарыст».
С. Грахоўскі. «Касманаўты».
Х. Гурыновіч. «Маленькая даярка».
С. Дзяргай. «Зерне».
В. Жуковіч. «Выбіраю прафесію».
Х. Жычка. «Рэгуліроўшчык».
К. Камейша. «Ганчары».
К. Кірэенка. «Вучуся ў таты».
Янка Купала. «Сыны».
М. Маляўка. «Як дом будавалі».
М. Пазнякоў. «Побач з татам».
П. Пруднікаў. «Будаўнік».
Д. Слаўковіч. «Калі растуць агуркі».
Я. Хвалей. «Урок працы».
М. Чарняўскі. «Змайстравалі сані».

## МІРНА ЖЫЦЬ – ШЧАСЛІВЫМ БЫЦЬ
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

### Для чытання і вывучэння ў класе

М. Даніленка. «Ордэн».
А. Махнач. «Юныя абаронцы».
І. Муравейка. «На вайне і не такое бывае» («Подзвіг ката Марціна»).
М. Пазнякоў. «Помнік герою».
Б. Сачанка. «Хлеб».

### Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Мой горад Мінск у час ваенны».
М. Гіль. «Партызанскі фотаздымак».
Л. Дайнека. «Прынясіце кветкі салдатам».
А. Дзеружынскі. «Крынічка партызанская».
А. Дудараў. «Буслы».
В. Жуковіч. «Бусел над Хатынню».
М. Маляўка. «Дзякуй за мір, перамога!».

І. Муравейка. «На вайне і не такое бывае» («Адважны»).
І. Стадольнік. «Боты».

## ХТО СПОРТАМ ЗАЙМАЕЦЦА, ТОЙ СІЛЫ НАБІРАЕЦЦА
(4 гадзіны)

Для чытання і вывучэння ў класе

М. Маляўка. «Будзем біць рэкорды», «Велагонка».
Н. Гілевіч. «Сябры ў паходзе».
В. Шымук. «Канікулы».

## ФАРМІРАВАННЕ НАВЫКУ ЧЫТАННЯ І ЎНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Станаўленне спосабу чытання цэлымі словамі і спалучэннямі слоў.

Нарошчванне тэмпу чытання і набліжэнне яго да хуткасці размоўнага маўлення навучэнца.

Фарміраванне правільнага чытання з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай мовы.

Авалоданне наступнымі відамі чытання на новым і больш складаным, чым у II класе, вучэбным матэрыяле: чытанне ўслых, пра сябе (моўчкі), азнаямляльнае чытанне, выбарачнае чытанне, чытанне па ролях, выразнае чытанне, праглядавае чытанне.

Авалоданне сродкамі выразнага чытання:

інтаніраванне сказаў у адпаведнасці са знакамі прыпынку;

захаванне паўз унутры і ў канцы сказа з апорай на знакі прыпынку (коску, двукроп'е, кропку з коскай і працяжнік), паміж абзацамі;

вылучэнне з дапамогай лагічнага націску слоў, якія абазначаюць пералік прадметаў, дзеянняў, якасцей, слоў-параўнанняў, слоў-звароткаў, важных па сэнсе слоў;

захаванне тону і тэмпу чытання ў залежнасці ад эмацыянальнага настрою твора, стану герояў;

вызначэнне з дапамогай педагагічнага работніка задачы выразнага чытання: што неабходна перадаць слухачам пры чытанні.

Развіццё ўніверсальных вучэбных уменняў:

вылучаць у тэксце незнаёмыя і незразумелыя словы, выразы;

карыстацца кантэкстам, тлумачальным слоўнікам, глабальнай камп'ютарнай сеткай Інтэрнэт для высвятлення іх значэнняў;

вылучаць ключавыя (апорныя) словы ў тэксце;

з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай прачытаць;

з дапамогай педагагічнага работніка планаваць сваю дзейнасць: называць у паслядоўнасці дзеянні для вырашэння вучэбнай задачы (пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразным чытанні, слоўным маляванні, складанні плана);

кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і яе вынікам;

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу пры абмеркаванні матэрыялу;

выконваць правілы ўзаемадзеяння ў групе, пары;

паважліва ставіцца да іншага меркавання.

Віды дзейнасці: слуханне, чытанне ўслых, чытанне пра сябе (моўчкі), азнаямляльнае чытанне, пошукавае, праглядавае чытанне дзіцячай перыёдыкі, выбарачнае чытанне, выразнае чытанне, чытанне па ролях; чытанне ланцужком па сказе, абзацы; камбінаванае чытанне (педагагічны работнік – навучэнцы); чытанне скорагаворак; вылучэнне і чытанне ключавых слоў абзаца, сэнсавай часткі, тэксту; выкананне артыкуляцыйных і арфаэпічных практыкаванняў; вызначэнне вучэбнай задачы чытання; устаноўка паслядоўнасці дзеянняў пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразным чытанні, слоўным маляванні; складанне плана; пошук памылак і моцных бакоў у сваім і чужым чытанні; ацэнка з пазіцый правільнасці і выразнасці.

## ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ І ЎНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Чытацкія ўменні фарміруюцца падчас практычнай работы з тэкстам з дапамогай уключэння навучэнцаў у розныя віды дзейнасці.

Навучэнцы вучацца:

прагназаваць эмацыянальны характар, жанр і змест твораў па ілюстрацыях і загалоўку;

вылучаць дзейных асоб, называць галоўнага героя, вызначаць яго ўчынак і прычыну ўчынку;

знаходзіць словы і выразы, якія перашкаджаюць разуменню прачытанага, вызначаць іх значэнне праз кантэкст, зноскі, з дапамогай слоўніка і глабальнай камп’ютарнай сеткай Інтэрнэт;

вызначаць час і месца падзей, устанаўліваць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі: паслядоўныя і прычынныя;

вызначаць тэму і галоўную думку твора, суадносіць загаловак твора з яго тэмай і галоўнай думкай;

назіраць за эмацыянальным станам героя і суадносіць гэты стан з учынкам;

вылучаць у тэксце сказы, якія апісваюць стан, пачуцці дзейных асоб, адносіны пісьменніка да іх (па выразных словах, прамым выказванні);

вызначаць аўтарскі пункт погляду і выказваць свае меркаванні аб учынках герояў; даваць сваю ацэнку ўчынку, герою;

знаходзіць з дапамогай выбарачнага чытання апісанне знешнасці героя, карцін прыроды;

уяўляць у сваёй свядомасці героя, карціну прыроды і расказваць аб гэтым;

ствараць характарыстыку героя твора (станоўчага, адмоўнага);

складаць партрэтную характарыстыку персанажаў з прывядзеннем прыкладаў з тэксту, знаходжанне ў тэксце сродкаў адлюстравання герояў і выражэння іх пачуццяў, параўнанне герояў па іх знешнім выглядзе і ўчынках, устанаўленне ўзаемасувязі паміж учынкамі, пачуццямі герояў;

узнаўляць «дэфармаваны» паэтычны тэкст;

складанне пытальнага плана тэксту з вылучэннем эпізодаў, сэнсавых частак: вызначаць агульны эмацыянальны настрой твора;

назіраць за будовай эпічнага твора, з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць яго структурныя часткі: пачатак, развіццё дзеяння, канцоўка;

самастойна складаць план тэксту; падрабязна і выбарачна (з дапамогай педагагічнага работніка) пераказваць твор па плане;

пераказваць змест твора, выкарыстоўваючы розныя тыпы маўлення з улікам спецыфікі мастацкага, навукова-пазнавальнага і вучэбнага тэкстаў (з дапамогай педагагічнага работніка);

калектыўна складаць творчы пераказ;

ілюстраваць змест твора малюнкамі (слоўнае і графічнае маляванне), падбіраць подпісы да іх;

інсцэніраваць нескладаны сюжэтны твор (казку, апавяданне) або асобныя яго эпізоды;

знаходзіць у вершы рыфму, прыклады гукапісу;

знаходзіць у творы выяўленчыя сродкі мастацкага маўлення (параўнанне, адушаўленне прадметаў, эпітэт, эмацыянальна-ацэначныя словы) і ўзнаўляць на гэтай падставе слоўныя карціны;

знаходзіць з дапамогай педагагічнага работніка ў творы эмацыянальна-ацэначныя словы, вызначаць іх сэнсавую ролю;

вылучаць у навукова-пазнавальным тэксце факты, дакладныя звесткі, знаходзіць знешняе апісанне прадмета, фармуляваць пытанні да навукова-пазнавальнага тэксту (з дапамогай педагагічнага работніка), ацэньваць інфармацыю (дзе можна выкарыстаць гэтыя веды);

суадносіць два віды тэкстаў: навукова-пазнавальны і мастацкі (з дапамогай педагагічнага работніка);

адрозніваць жанры твораў фальклору (песня, казка, прыказка);

адрозніваць жанры аўтарскай літаратуры (літаратурная казка, апавяданне, верш, байка);

адрозніваць віды вершаў (вершы-апісанні, вершы-партрэты);

вылучаць жанравыя асаблівасці казкі, апавядання, верша;

канструіраваць (мадэліраваць) план твора;

працаваць з табліцамі і схемамі;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу па пытаннях тэмы ўрока;

правяраць вынікі сваёй работы па прапанаваным узоры (крытэрыях);

параўноўваць творы розных відаў мастацтва (фальклору, літаратуры, жывапісу, музыкі);

дэманстраваць начытанасць і сфарміраванасць спецыяльных чытацкіх уменняў: суаднясенне прозвішчаў аўтараў з загалоўкамі твораў, вызначэнне тэм указаных твораў, знаходжанне памылкі ў прапанаванай паслядоўнасці;

складаць выставы кніг на прапанаваную тэму;

шукаць у даведачнай літаратуры дадатковую інфармацыю.

## ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЯ ПРАПЕДЭЎТЫКА

Літаратура як мастацтва слова.

Агульнае ўяўленне пра жанр як разнастайнасць літаратурных твораў.

Агульнае ўяўленне пра жанравыя асаблівасці вуснай народнай творчасці: народныя песні (калыханкі, восеньскія, калядныя, вяснянкі), забаўлянкі-пацешкі, прыпеўкі, прыказкі, скорагаворкі, загадкі, народная казка.

Агульнае ўяўленне пра жанравыя асаблівасці твораў аўтарскай літаратуры; літаратурная казка, апавяданне, верш.

Агульнае ўяўленне пра віды казак (чарадзейная, пра жывёл, бытавая); пра віды вершаў (верш-апісанне, верш-партрэт, верш-разважанне).

Пункт гледжання аўтара і чытача (адносіны аўтара і чытача да ўчынку, героя).

Партрэт героя, характарыстыка героя (агульнае ўяўленне).

Настрой розных мадальнасцей і адценняў: радасны, сумны, гераічны, таямнічы, урачысты, злы, узрушаны, пакрыўджаны (пашырэнне ўяўленняў).

Агульнае ўяўленне пра выяўленча-вобразныя сродкі мастацкага маўлення: параўнанне, адушаўленне прадметаў, з’яў прыроды, эпітэт, эмацыянальна-ацэначныя словы.

Агульнае ўяўленне пра навукова-пазнавальныя творы.

Авалоданне і аперыраванне літаратурнымі тэрмінамі: фальклор, вусная народная творчасць, літаратура, жанр, твор, казка, верш, байка, апавяданне, аўтар (празаік, паэт), назва (загаловак), эпізод, герой (персанаж), партрэт, характарыстыка, выразныя сродкі мастацкага маўлення, параўнанне, адушаўленне прадметаў, з'яў прыроды, эпітэт, эмацыянальна-ацэначныя словы, рыфма, навукова-пазнавальны тэкст.

Віды дзейнасці: назіранне за тэкстам твора (мастацкай формай структуры тэксту, мовай твора, сродкамі мастацкай выразнасці); уяўленне ў думках вобразаў мастацкага твора (паэтычных карцін прыроды, герояў, падзей); аналітычнай работа з тэкстам твора (тэкставы аналіз), складанне выказванняў параўнальнага, ацэначнага характару, высноў; параўнанне мастацкіх тэкстаў розных жанраў і герояў, вылучэнне жанравых прымет, пошук выяўленча-вобразных сродкаў мастацкага маўлення.

## ЛІТАРАТУРНА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ

Літаратурна-творчая дзейнасць ажыццяўляецца з дапамогай уключэння навучэнцаў у такія віды дзейнасці, як:

сачыненне (па аналогіі з творамі фальклору) казак, забаўных гісторый з героем вывучаных твораў, вершаў па апорных словах;

складанне апавядання па аналогіі з прачытаным, па дадзеным пачатку ці канцоўцы;

стварэнне ілюстрацыі да літаратурнага твора;

прыдумванне назвы твора, подпісаў да ілюстрацый;

творчая інтэрпрэтацыя твора: слоўнае маляванне паэтычных карцін, слоўнае апісанне героя твора;

складанне апавядання-апісання па ілюстрацыях або карціне;

выразнае чытанне па ролях дыялогаў літаратурных герояў, апавядання апавядальнага характару, казкі;

інсцэніроўка эпізодаў, асобных фрагментаў мастацкага твора (з рэплікамі і рухамі, пастаноўка «жывых карцін»);

«інтэрв'ю» з персанажам, які спадабаўся;

прыдумванне працягу праслуханага (прачытанага) апавядання;

стварэнне сціслага водгуку аб самастойна прачытаным творы па зададзеным узоры (з дапамогай педагагічнага работніка);

разыгрыванне дыялогаў з выражэннем настрою герояў;

падрыхтоўка творчага праекта на зададзеную тэму (з дапамогай педагагічнага работніка);

конкурснае чытанне вывучаных вершаў.

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ (АСНОЎНЫ ЭТАП) КОЛА ЧЫТАННЯ

Мастацкія, навукова-мастацкія і навукова-пазнавальныя творы беларускіх, рускіх і замежных аўтараў, дзіцячая даведачная літаратура, дзіцячыя часопісы і газеты (на выбар педагагічнага работніка).

Тыпы дзіцячых кніг для пазакласнага чытання: кніга-твор; кніга-зборнік (аўтарскі або тэматычны); кніга-даведнік; дзіцячая энцыклапедыя; школьны тлумачальны слоўнік.

Жанры: казкі, апавяданні, аповесці-казкі, вершы, навукова-пазнавальныя артыкулы.

## ФАРМІРАВАННЕ САМАСТОЙНАЙ ЧЫТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Навучэнцы вучацца:

выбіраць кнігі на вызначаную тэму, карыстаючыся відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі: кніжнай выставай, рэкамендацыйным спісам, адкрытым доступам да кніжных паліц (самастойна і з дапамогай бібліятэкара);

арыентавацца ў групе кніг (2–4) да чытання;

вызначаць тэму чытання па выставе кніг;

з дапамогай бібліятэкара выбіраць неабходную кнігу па дадзеных прыметах: па тэме ўрока пазакласнага чытання, па жанры і аўтарскай прыналежнасці (з экспазіцыі кніжнай выставы);

разглядаць новую кнігу, вызначаць яе змест па знешніх прыметах (назве і ілюстрацыях);

арыентавацца ў кнігах аднаго аўтара або кнігах розных аўтараў з улікам наступных паказчыкаў: прозвішча аўтара, загаловак, ілюстрацыя на вокладцы ці ў кнізе, тытульны ліст, змест, прадмова, ці ўводзіны, пасляслоўе, анатацыя (калі яны ёсць);

узнаўляць змест самастойна прачытанай кнігі, выказваць ацэначныя меркаванні пра паводзіны і ўчынкі герояў, вызначаць асабістыя адносіны да падзей, учынкаў, герояў;

працаваць з дзіцячай даведачнай літаратурай (кнігай-даведнікам, дзіцячай энцыклапедыяй, тлумачальным слоўнікам) у чытальнай зале бібліятэкі, дома;

разглядаць і чытаць дзіцячыя часопісы і газеты з дапамогай праглядавага чытання ў чытальнай зале бібліятэкі.

## АСНОЎНЫЯ ВЕДЫ І ЎМЕННІ

Навучэнцы знаёмяцца з правіламі работы ў чытальнай зале бібліятэкі (школьнай, раённай).

Аваладваюць тэрмінамі «тытульны ліст», «прадмова», «пасляслоўе пра аўтара», «змест», «нумар часопіса», «год выдання часопіса», «экзэмпляр».

Навучэнцы вучацца:

Знаходзіць у бібліятэцы кнігі на зададзеную тэму, карыстаючыся рэкамендацыйнымі паказчыкамі, тэматычнымі кніжнымі выставамі ці адкрытым доступам да кніжных паліц;

выбіраць кнігу ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай;

самастойна знаёміцца з кнігай па яе знешніх паказчыках (прозвішча аўтара, назва, ілюстрацыі);

вызначаць тэму і жанр;

карыстацца зместам;

вызначаць тэму творчасці пісьменніка па яго кнігах;

знаходзіць інфармацыю пра асобу і творчасць пісьменніка з дапамогай прадмовы і пасляслоўя да яго кніг, даведачнай літаратуры, электонных сродкаў навучання;

наладжваць кніжную выставу па тэме, якую ўказаў педагагічны работнік;

самастойна знаёміцца з дзіцячымі часопісам і газетай з дапамогай праглядавага чытання;

карыстацца слоўнікамі, кнігамі-даведнікамі.

## ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ І ГРУПАВАЯ РАБОТА З КНІГАЙ У ПАЗАЎРОЧНЫ ЧАС

Наведванне бібліятэкі і арыентацыя ў свеце кніг па тэматычнай і аўтарскай кніжнай выставе ў прасторы бібліятэкі.

Работа ў чытальнай зале з даведачнай літаратурай, дзіцячымі часопісамі і газетамі.

Складанне кніжных выстаў па тэме, указанай педагагічным работнікам.

Праца ў «майстэрні па рамонце кніг».

Падрыхтоўка і ўдзел у літаратурных віктарынах, ранішніках і конкурсах.

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

Эдзі Агняцвет. «Буду настаўнікам».

М. Багдановіч. «Перад паводкай».
Н. Галіноўская. «Сябры прыроды».
У. Карызна. «Лісце прыляцела».
Якуб Колас. «Зіма» («Надышлі марозы...»).
Янка Купала. «Лістапад».
А. Русак. «Мой край».
В. Шымук. «Канікулы».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ III КЛАСА

Ведаць:

прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх неаднойчы сустракаліся на вучэбных занятках па літаратурным чытанні, і іх творы (назва, імёны герояў, асноўны змест);

творы, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

правілы работы ў чытальнай зале бібліятэкі (школьнай, раённай).

Мець першапачатковае ўяўленне пра:

жанр як разнастайнасць літаратурных твораў;

жанравыя асаблівасці твораў фальклору: народную песню, казку, прыказку;

жанравыя асаблівасці твораў аўтарскай літаратуры: літаратурную казку, апавяданне, верш;

віды народных песень (восеньскія, калядныя, вяснянкі);

віды вершаў (вершы-апісанні, вершы-партрэты);

выяўленча-вобразныя сродкі мовы мастацкага твора (параўнанне, адушаўленне прадметаў, з’яў прыроды, эпітэт, эмацыянальна-ацэначныя словы);

навукова-пазнавальныя творы.

Умець:

чытаць правільна, усвядомлена і выразна ўслых цэлымі словамі тэксты розных відаў (мастацкі, навукова-пазнавальны, вучэбны) у адпаведнасці з арфаэпічнымі нормамі ў тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага;

выразна чытаць падрыхтаваны мастацкі твор ці ўрывак з захаваннем інтанацыі сказа і паўз на знаках прыпынку ў адпаведнасці з эмацыянальным настроем твора, станам героя;

чытаць цэлымі словамі правільна з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай мовы: захоўваць найбольш распаўсюджаныя арфаэпічныя нормы (вымаўленне гукаў [ў], [г], [ж], [ч], [р], [ц’], [дз’], [дж], спалучэння [шч], падоўжаных зычных);

чытаць па ролях дыялогі герояў твора, асобныя эпізоды сюжэтных твораў (казка, апавяданне);

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

вызначаць вучэбную задачу чытання: з якой мэтай павінны прачытаць (з дапамогай педагагічнага работніка);

планаваць сваю дзейнасць: называць у паслядоўнасці дзеянні пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразнага чытання, слоўнага малявання (з дапамогай педагагічнага работніка);

кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і яе вынікам;

прагназаваць да чытання змест твора па ілюстрацыях і назве;

вылучаць у тэксце незразумелыя словы і выразы, вызначаць іх значэнне праз кантэкст, зноскі, з дапамогай слоўніка і глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт;

вызначаць тэму і галоўную думку твора (самастойна ці з дапамогай педагагічнага работніка);

знаходзіць у тэксце словы, якія ўказваюць на эмацыянальны настрой героя, яго пачуцці, адносіны аўтара да адлюстраваных з'яў (па прамым выказванні);

характарызаваць героя на падставе яго паводзін, перажыванняў і ўчынкаў, выказваць свае адносіны да яго;

выяўляць аўтарскі пункт погляду і выказваць свае думкі пра ўчынкі герояў, даваць сваю ацэнку ўчынку, герою;

ствараць слоўныя ілюстрацыі па змесце твора (слоўнае апісанне па ўяўленні героя твора, слоўнае апісанне па ўяўленні паэтычных карцін, эпізодаў тэксту);

працаваць з тэкстам: дзяліць на сэнсавыя часткі, складаць план, падрабязна і выбарачна пераказваць мастацкі твор па гатовым плане;

вылучаць у навукова-пазнавальным тэксце факты, дакладныя звесткі, знаходзіць апісанне прадмета, факта;

працаваць у групе, ствараючы інсцэніроўкі нескладаных сюжэтных твораў;

крытычна ацэньваць дзіцячыя творчыя работы падчас абмеркавання;

арыентавацца ў літаратурных тэрмінах і ўжываць іх да месца пры адказе на пытанне: фальклор, вусная народная творчасць, жанр, твор, празаік, паэт, эпізод, герой (персанаж), партрэт, характарыстыка, параўнанне, адушаўленне прадметаў, з'яў прыроды, эпітэт, рыфма, навукова-пазнавальны тэкст, тытульны ліст, прадмова, змест, нумар часопіса, год выдання часопіса, экзэмпляр;

прыводзіць прыклады народных песень, казак (народных і літаратурных), вершаў, апавяданняў з кола твораў;

адрозніваць мастацкі і навукова-пазнавальны тэкст;

знаходзіць у бібліятэцы кнігі на зададзеную тэму, карыстаючыся рэкамендацыйнымі паказчыкамі, тэматычнымі выставамі або адкрытым доступам да кніжных паліц;

самастойна знаёміцца з творам і кнігай да чытання;

карыстацца даведачным апаратам падручніка.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

самастойна выбіраць і чытаць кнігі, дзіцячыя перыядычныя выданні;

карыстацца ўсімі відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі;

самастойна знаёміцца з творамі і кнігай да чытання;

арыентавацца ў кнігах па змесце;

выказваць ацэначныя погляды аб прачытаным творы (героі, падзеі), кнізе, прагледжаным фільме, спектаклі;

карыстацца тлумачальным слоўнікам;

прымаць удзел у літаратурных конкурсах.

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў IV КЛАСЕ
## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

(70 гадзін, з іх 58 гадзін – чытанне раздзелаў вучэбнага дапаможніка і падагульненне ведаў па раздзелах чытання, 9 гадзін – пазакласнае чытанне, 2 гадзіны – праверка навыку чытання, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

### КОЛА ЧЫТАННЯ

### ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА
(9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка навыку чытання)

Для чытання і вывучэння ў класе

В. Гардзей. «Жнівень».

І. Грамовіч. «Выпаў снег».

Р. Ігнаценка. «Бабіна лета».

Клаўдзія Каліна. «Буслы».

Якуб Колас. «Усход сонца».

Г. Скаржынская-Савіцкая. «Чаму пралескі сінія».

Фальклорны матэрыял: народныя загадкі пра з’явы прыроды.

Для пазакласнага чытання

К. Буйло. «Мой Мурка», «У лесе».
А. Бутэвіч. «Як сасна з бярозай пасябравала».
С. Быкава. «Свавольніцы», «Заранка», «Гарэза-праменьчык».
Змітрок Бядуля. «Сняжыначкі-пушыначкі».
А. Васілевіч. «Геша».
Я. Галубовіч. «Забаўнае паляванне», «Сцяжынка», «Што аднаму цяжка, тое гуртам лёгка».
В. Гардзей. «Залаты лістапад».
Ц. Гартны. «Восень».
Н. Гілевіч. «Цуд тварыўся – праспаў…», «Здарэнне ў лесе».
П. Глебка. «На пачатку лета».
У. Дубоўка. «Восень», «Раскрытая кніга», «Хто дужэйшы?».
В. Жуковіч. «Скалечаны голуб», «У зялёным лузе».
Янка Журба. «Першыя сняжынкі».
В. Кажура. «Пакацілася сонейка».
Клаўдзія Каліна. «Красавік», «Стракатая сойка».
К. Камейша. «Зімовы верш».
А. Капусцін. «Казка старой сасны».
Г. Каржанеўская. «Мышка», «Дзе ты, Боця?».
Якуб Колас. «Каля рэчкі», «Летам».
М. Корзун. «Міколкаў барометр».
Янка Купала. «Вясна».
Э. Луканскі. «Верабейка».
М. Лынькоў. «Ластаўчына талака».
В. Мыслівец. «Жураўлі і жураўка».
Г. Пашкоў. «Палессе», «Раніца ў пушчы», «У жытнім полі».
З. Прыгодзіч. «Джэк і Рыжык».
П. Ткачоў. «Тася».
К. Хадасевіч-Лісавая. «У кожнага свае справы».
І. Шамякін. «Воўк».

## ЧАЛАВЕК І ЯГО РОД
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Н. Гілевіч. «Я – беларус».

А. Грачанікаў. «Бацькоўскі парог».
А. Карлюкевіч. «Вавёрка піша сачыненне».
Легенда «Палешукі і палевікі».
Б. Сачанка. «Адкуль пайшоў твой род?».

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Слова пра маці».
Л. Багдановіч. «Адзіная, як маці!».
В. Вітка. «Вавёрчына гора».
Янка Купала. «Над калыскай».
А. Ставер. «Унуку».
В. Шырко. «Дзед Манюкін не салжэ», «Дзед Манюкін і ўнукі».

## ЧАЛАВЕК І РАДЗІМА
(8 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

П. Броўка. «Дарагая Беларусь».
К. Буйло. «Люблю».
Н. Гальпяровіч. «Бацька гарадоў беларускіх» (урывак).
У. Карызна. «Люблю цябе, Белая Русь».
А. Каско. «Горад з Белаю вежаю».
Я. Сіпакоў. «Любая мая Беларусь».

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Кліча вецер свежы».
А. Астрэйка. «Родная краіна».
А. Гурло. «Мой край».
В. Жуковіч. «Цудоўная краіна», «Беларус», «Няма даражэйшай зямлі», «Беларуская старонка» «Францішак Скарына».
А. Зэкаў. «Па-беларуску і па-руску», «Чатыры зярняткі».
У. Карызна. «Песня аб родным».
Я. Крупенька. «Два словы»
У. Мазго. «Мірскі замак».
М. Маляўка. «Полацк».
Г. Марчук. «Як Несцерка французаў перахітрыў».
М. Пазнякоў. «Адказ сыну», «Радзіма», «У бары», «Заўжды вярнуся».
А. Пісьмянкоў. «Мы – беларусы».

К. Цвірка. «Там яна».
В. Шпакевіч. «Мая зямля».

## ЧАЛАВЕК, СЛОВА І КНІГА
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

Л. Дайнека. «Любіце мову».
А. Масла. «Як з'явіўся апостраф».
С. Зелянко. Апавяданні з кнігі «Таямніцы беларускай мовы».
К. Цвірка. «У кнігарні».
Фальклорны матэрыял: прыказкі пра слова і кнігу.

### Для пазакласнага чытання

М. Арочка. «Цяжкае пытанне».
Л. Багдановіч. «Мы дзеці мовы беларускай».
П. Броўка. «Родныя словы».
Т. Бунта. «Добры дзень!».
В. Вітка. «Слова», «Шляхі-дарогі».
В. Жуковіч. «Кніга».
А. Зэкаў. «Дзве мовы».
А. Канапелька. «Роднае слова».
М. Пазнякоў. «Скарына».
П. Панчанка. «Хлебныя словы».
Г. Пашкоў. «Родная мова».
П. Прыходзька. «Твая мова».
Ю. Свірка. «Словы».
М. Чарняўскі. «Прыгода з Коскаю».

## ЧАЛАВЕК І МАСТАЦТВА
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

А. Грачанікаў. «Народ і песні».
Э. Валасевіч. «Шпачыны канфуз».
Янка Купала. «Песня і казка».
М. Чарняўскі. «Слуцкія паясы».
Фальклорныя творы:

беларуская народная казка «Музыка-чарадзей»,
легенда «Адкуль песня беларуская».

Для пазакласнага чытання

Т. Бунта. «Урок музыкі».
Змітрок Бядуля. «Дудачка».
А. Дзеружынскі. «Наш беларускі ручнік».
У. Карызна. «Іграй, жалейка, не змаўкай…».
Максім Танк. «Казка пра музыку».
М. Чарняўскі. «Цымбалы».

## БЫЦЬ НА ЗЯМЛІ ЧАЛАВЕКАМ
(9 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

Для чытання і вывучэння ў класе

Н. Гілевіч. «Калі рана ўстанеш».
В. Гурскі. «Верныя сябры».
В. Вітка. «Дзень нараджэння».
В. Жуковіч. «Першая настаўніца».
Н. Мацяш. «Калыханка маме».
У. Правасуд. «Фанабэрысты Мухамор».
П. Ткачоў. «Хітрун».
Фальклорныя творы:
беларуская народная казка «Стары бацька»,
прыказкі пра дружбу.

Для пазакласнага чытання

Эдзі Агняцвет. «Першае слова».
І. Аношкін. «Ленус-хранікалюс», «Дружная сямейка».
Р. Барадулін. «Грамат не хапіла».
Т. Бунта. «Дзіўная сінічка».
Я. Бяганская. «Атося».
Змітрок Бядуля. «Казка пра мядзведзя».
Э. Валасевіч. «Мітрафан і дэльтаплан», «Сама», «Арэхі і агрэхі», «Кот і вожык», «Арэх і жаба».
А. Васілевіч. «Маміна свята».
В. Вітка. «Самая дарагая рэч у нашым доме», «Добры знак»
Н. Галіноўская. «Фантазёр».

С. Гаўрусёў. «Пад апекаю бацькоў».
В. Жуковіч. «Трэба», «Свет – дзівосны».
Г. Марчук. «Прыгоды дзяўчынкі Агапкі і ката Фокуса».
А. Масла. «Цудадзейныя лекі».
У. Корбан. «Казёл і Муха».
А. Крэйдзіч. «Сінічкі міратворцы».
М. Пазнякоў. «Хітры Іванка», «Цукеркі».
У. Правасуд. «Вузел».
П. Рунец. «Аднойчы вечарам».
М. Скрыпка. «Індык», «Апанас», «Звяглівы Лыска».
Максім Танк. «Конь і леў», «Казка пра мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх».
М. Чарняўскі. «Чарадзейныя пруткі».
В. Шпакевіч. «Любіце родных».
Ф. Янкоўскі. «І за гарою пакланюся».

## ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА

(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка навыку чытання)

### Для чытання і вывучэння ў класе

У. Корбан. «Пчала і Ружа».
В. Шымук. «Лёгка нам нічога не даецца».
Фальклорныя творы:
беларускія народныя казкі «Ад крадзенага не пасыцееш», «Андрэй за ўсіх мудрэй».

### Для пазакласнага чытання

Л. Багдановіч. «Праспалі свята».
А. Бадак. «Воўк і навука».
А. Бутэвіч. «Бунт у каралеўстве Віндаўса Вялікага».
С. Давідовіч. «Кемлівы Заяц!».
А. Зэкаў. «Чатыры зярняткі».
К. Ладуцька. «З Брэсцкай Тамашоўкі».
П. Місько. «Добры чалавек»
Г. Скаржынская-Савіцкая. «Прывід», «Перахітрыў».
Максім Танк. «Падарожжа мураша Бадзіні».
К. Хадасевіч-Лісавая. «Велапрабег з прыгодамі», «Ліст да Дзеда Мароза», «Чароўная ракавіна», «Вухуцік».

М. Чарняўскі. «Урок ветлівасці».
І. Шуцько. «Труцень і пчолкі».
Легенды. «Золата ў прыполе», «Ліхая доля».

## ЧАЛАВЕК І ЭКАЛОГІЯ
(7 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне)

### Для чытання і вывучэння ў класе

П. Броўка. «А ты хоць дрэва пасадзіў?».
М. Даніленка. «Журка».
М. Пазнякоў. «Клён».
У. Правасуд. «Вадзянік і Лесавік».
Г. Пашкоў. «Выратаванне вожыка».
Я. Сіпакоў. «Беручы – аддаваць».

### Для пазакласнага чытання

Н. Галіноўская. «Хата для шпакоў».
М. Гамолка. «Васілёва бярозка».
Н. Гілевіч «Сіняя пушча».
Х. Гурыновіч. «Давайце пасадзім па дрэўцу», «Праталіны».
У. Правасуд. «Мядзведзевы забавы».
Я. Пушча. «Белавежа».
І. Шамякін. «Чорны прамень».
М. Янчанка. «Як я расой лячыўся».

## ЛЁС ЧАЛАВЕКА НА ВАЙНЕ
(6 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пазакласнае чытанне, 1 гадзіна – праверка сфарміраванасці чытацкіх уменняў)

### Для чытання і вывучэння ў класе

П. Броўка. «А хіба ёсць, што забываюць?».
Я. Брыль. «Зялёная школа».
М. Чарняўскі. «Клятва Марата Казея».
М. Янчанка. «Сустрэча з бацькам».

### Для пазакласнага чытання

А. Астрэйка. «Плошча Перамогі».

А. Грачанікаў. «Каля помніка партызанскай славы “Прарыў”».
А. Куляшоў. «Над спаленай вёскай».
Я. Маўр. «Дом пры дарозе», «Завошта».
П. Панчанка. «Дзеці вайны».
І. Шамякін. «Алёша-разведчык».
Г. Шыловіч. «Была нядзеля…».
Апавяданні з кнігі «Ніколі не забудзем».

## ЧАЛАВЕК, КОСМАС І СУСВЕТ
(5 гадзін)

Для чытання і вывучэння ў класе

В. Жуковіч. «Хараство Сусвету».
П. Клімук. «На касмічным караблі».
У. Мазго. «Суседзі па Сусвеце».
А. Масла. «Калючык і космас».
К. Цвірка. «Да зорак».

## ФАРМІРАВАННЕ НАВЫКУ ЧЫТАННЯ І ЎНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Удасканаленне навыку чытання цэлымі словамі і спалучэннямі слоў. Нарошчванне тэмпу чытання і набліжэнне яго да хуткасці размоўнага маўлення навучэнца.

Фарміраванне і развіццё правільнага чытання з захаваннем фанетыка-арфаэпічных норм беларускай мовы.

Авалоданне наступнымі відамі чытання на новым і больш складаным, чым у III класе, вучэбным матэрыяле: чытанне пра сябе (моўчкі), азнаямляльнае чытанне, праглядавае чытанне, пошукавае чытанне, выбарачнае чытанне, чытанне па ролях, выразнае чытанне.

Далейшае авалоданне сродкамі выразнага чытання:

захаванне інтанацыі ў канцы сказа, паўз унутры і ў канцы сказа, паміж абзацамі, паміж вершаванымі строфамі;

вылучэнне з дапамогай лагічнага націску важных па сэнсе слоў;

захаванне тону і тэмпу чытання ў залежнасці ад эмацыянальнага стану героя і эмацыянальнага настрою твора;

самастойнае вызначэнне задачы выразнага чытання: што неабходна перадаць слухачам пры чытанні.

Развіццё ўніверсальных вучэбных дзеянняў:

вылучаць у тэксце незнаёмыя і незразумелыя словы, выразы; карыстацца кантэкстам, зноскамі, тлумачальным слоўнікам, глабальнай камп'ютарнай сеткай Інтэрнэт для высвятлення значэнняў слоў;

вылучаць ключавыя (апорныя) словы ў тэксце;

вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай прачытаць;

планаваць дзейнасць: называць у паслядоўнасці дзеянні для вырашэння вучэбнай задачы (пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразным чытанні, слоўным маляванні, складанні плана, сціслым пераказе, інсцэніроўцы);

кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і яе вынікам;

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу пры абмеркаванні матэрыялу;

размяркоўваць ролі ў групе, дамаўляцца і выконваць правілы ўзаемадзеяння ў групе, пары;

паважліва ставіцца да іншага меркавання.

Віды дзейнасці: слуханне, чытанне ўслых, чытанне пра сябе (моўчкі), азнаямляльнае чытанне, пошукавае, праглядавае чытанне дзіцячай перыёдыкі, пошукавае чытанне даведачнай літаратуры, выбарачнае чытанне, выразнае чытанне, чытанне па ролях; камбінаванае чытанне (педагагічны работнік – навучэнцы); вылучэнне і чытанне ключавых слоў абзаца, сэнсавай часткі, тэксту; выкананне акцэнталагічных і арфаэпічных практыкаванняў; вызначэнне вучэбнай задачы чытання; планаванне дзейнасці пры падрыхтоўцы да чытання па ролях, выразным чытанні, слоўным маляванні, складанне плана, пошук памылак і моцных бакоў у сваім і чужым чытанні; ацэнка чытання з пазіцый правільнасці і выразнасці.

## ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКІХ УМЕННЯЎ І ЎНІВЕРСАЛЬНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Навучэнцы вучацца:

прагназаваць эмацыянальны характар, жанр і змест мастацкага твора па ілюстрацыях і загалоўку;

знаходзіць словы і выразы, якія перашкаджаюць разуменню прачытанага, вызначаць іх значэнне праз кантэкст, зноскі, з дапамогай слоўніка і глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт;

устанаўліваць сэнсавыя сувязі паміж падзеямі: паслядоўныя і прычынныя; разважаць над сувяззю эпізодаў; супастаўляць асобныя эпізоды твора;

вызначаць самастойна тэму і асноўную думку твора;

вылучаць дзейных асоб, называць галоўнага героя, вызначаць учынак і прычыну ўчынку;

самастойна знаходзіць у тэксце словы, якія ўказваюць на эмацыянальны настрой героя, яго пачуцці, адносіны аўтара да адлюстраваных падзей;

знаходзіць у творы апісанне знешнасці героя (партрэт), інтэр'ера памяшкання, карцін прыроды: усведамляць ролю гэтых апісанняў у раскрыцці ўнутранага свету героя;

уяўляць у сваёй свядомасці героя, карціну прыроды і расказваць аб гэтым;

ствараць характарыстыку героя твора (станоўчага, адмоўнага);

складаць партрэтную характарыстыку персанажаў з прывядзеннем прыкладаў з тэксту, знаходжанне ў тэксце сродкаў адлюстравання герояў і выражэння іх пачуццяў, параўнанне герояў па іх знешнім выглядзе і ўчынках, устанаўленне ўзаемасувязі паміж учынкамі, пачуццямі герояў;

узнаўляць «дэфарміраваны» паэтычны тэкст;

складаць пытальны план тэксту з вылучэннем эпізодаў, сэнсавых частак:

характарызаваць героя на падставе яго паводзін, перажыванняў і ўчынкаў, выказваць свае адносіны да яго;

вызначаць аўтарскія адносіны і выказваць свае меркаванні аб падзеях, учынках герояў; даваць сваю ацэнку ўчынку, герою;

вызначаць агульны эмацыянальны настрой паэтычнага твора;

аналізаваць кампазіцыю твора (з дапамогай педагагічнага работніка);

назіраць за будовай эпічнага твора, з дапамогай педагагічнага работніка вызначаць яго структурныя часткі: пачатак, развіццё дзеяння, кульмінацыю, канцоўку;

самастойна складаць план твора і карыстацца ім падчас пераказу; падрабязна і сцісла (з дапамогай педагагічнага работніка) пераказваць сюжэт твора; выбарачна пераказваць асобны эпізод, апісанне персанажа, апісанне карціны прыроды; пераказваць змест твора, выкарыстоўваючы розныя тыпы маўлення з улікам спецыфікі мастацкага, навукова-пазнавальнага і вучэбнага тэкстаў (з дапамогай педагагічнага работніка);

знаходзіць у творы выяўленчыя сродкі мастацкага маўлення (параўнанне, адушаўленне, эпітэт, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы), вызначаць іх ролю ў стварэнні вобраза, узнаўляць на гэтай аснове слоўныя карціны;

адрозніваць і называць фальклорныя жанры (песня, казка, прыказка), вылучаць іх жанравыя асаблівасці;

адрозніваць і называць жанры аўтарскай літаратуры (літаратурная казка, апавяданне, аповесць-казка, верш) і вызначаць іх жанравыя асаблівасці;

адрозніваць мастацкія і навукова-пазнавальныя літаратурныя творы, якія па-рознаму адлюстроўваюць свет;

вылучаць з навукова-пазнавальнага тэксту фактычны матэрыял, дакладныя звесткі, сістэматызаваць звесткі з дапамогай складання графічнага ці слоўнага плана (пад кіраўніцтвам педагагічнага работніка), складаць выказванні параўнальнага характару, ацэньваць інфармацыю (дзе можна выкарыстаць гэты веды);

валодаць прыёмамі завучвання вершаў (з апорай на ключавыя словы, уяўляемыя карціны, графічную і намаляваную схему);

ствараць маналагічнае выказванне на зададзеную тэму;

канструіраваць (мадэліраваць) план твора;

працаваць з табліцамі і схемамі;

удзельнічаць у вучэбным дыялогу па пытаннях тэмы ўрока;

правяраць вынікі сваёй работы па прапанаваным узоры (крытэрыях);

параўноўваць творы розных відаў мастацтва (фальклору, літаратуры, жывапісу, музыкі);

дэманстраваць начытанасць і сфарміраванасць спецыяльных чытацкіх уменняў: суаднясенне прозвішчаў аўтараў з загалоўкамі твораў, вызначэнне тэм указаных твораў, знаходжанне памылкі ў прапанаванай паслядоўнасці;

складаць выставы кніг на прапанаваную тэму;

выяўляць значэнне незнаёмага слова ў слоўніку;

шукаць у даведачнай літаратуры дадатковую інфармацыю.

## ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЯ ПРАПЕДЭЎТЫКА

Агульнае ўяўленне пра жанравыя асаблівасці твораў фальклору: народныя песні (калыханкі, восеньскія, калядныя, вяснянкі), забаўлянкі-пацешкі, прыпеўкі, прыказкі, скорагаворкі, загадкі, народныя казкі.

Агульнае ўяўленне пра жанравыя асаблівасці твораў аўтарскай літаратуры: аповесці, аповесці-казкі.

Пашырэнне ўяўленняў пра асаблівасці жанраў:

казка (народная і літаратурная, іх падабенства, асаблівасці кампазіцыі і мовы казкі);

верш (назіранне за рыфмай, радком, страфой, сродкамі выразнасці);

апавяданне (герой апавядання, месца дзеяння, учынак, адносіны аўтара да ўчынку; апавяданне мастацкае і навукова-пазнавальнае);

пашырэнне ўяўлення пра выяўленча-вобразныя сродкі мастацкага маўлення: параўнанне, адушаўленне, эпітэт, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы;

арыенціроўка ў пэўных літаратурных тэрмінах.

Віды дзейнасці: назіранне за тэкстам твора (мастацкай формай структуры тэксту, мовай твора, сродкамі мастацкай выразнасці); уяўленне ў думках вобразаў мастацкага твора: паэтычных карцін прыроды, герояў, падзей; аналітычная і ацэначная работа з тэкстам твора (тэкставы аналіз), складанне выказванняў параўнальнага, ацэначнага характару, высноў; параўнанне мастацкіх тэкстаў розных жанраў і герояў, вылучэнне жанравых прымет, пошук выяўленча-вобразных сродкаў мастацкага маўлення.

## ЛІТАРАТУРНА-ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ

Літаратурна-творчая дзейнасць ажыццяўляецца з дапамогай уключэння навучэнцаў у наступныя віды дзейнасці:

калектыўнае складанне апавядання на пэўную тэму, па дадзеным пачатку ці канцоўцы;

сачыненне казак, забаўных гісторый з героямі вывучаных твораў, вершаў па апорных словах;

складанне з дапамогай педагагічнага работніка сцэнарыя да мультфільма (з выкарыстаннем музычных твораў);

творчая інтэрпрэтацыя твора: слоўнае маляванне паэтычных карцін, эпізодаў тэксту, слоўнае апісанне героя;

складанне апавядання-апісання па ілюстрацыях або карціне;

складанне творчага пераказу ад імя аднаго з герояў, з творчым дапаўненнем сюжэта;

выразнае чытанне па ролях дыялогаў літаратурных герояў, апавядання апавядальнага характару, казкі;

інсцэніроўка эпізодаў, асобных фрагментаў мастацкага твора (з рэплікамі і рухамі), пастаноўка «жывых карцін»);

гульня-драматызацыя казачных сітуацый (перадача характару і настрою паходкай, жэстамі, голасам);

«інтэрв’ю» з персанажам, які спадабаўся;

прыдумванне працягу праслуханага (прачытанага) апавядання;

стварэнне сціслага водгуку аб самастойна прачытаным творы па дадзеным узоры;

разыгрыванне дыялогаў з выражэннем настрою герояў;

падрыхтоўка творчага праекта на зададзеную тэму (з дапамогай педагагічнага работніка);

стварэнне дзённіка летняга чытання;
рэпартаж з месца падзей;
конкурснае чытанне вывучаных вершаў.

## ПАЗАКЛАСНАЕ ЧЫТАННЕ (ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП)
## КОЛА ЧЫТАННЯ

Мастацкая, навукова-мастацкая і навукова-пазнавальная кніга, дзіцячая даведачная кніга (энцыклапедыя, даведнік, слоўнік), дзіцячыя часопісы і газеты (на выбар педагагічнага работніка). Сусветная дзіцячая мастацкая літаратура (беларуская, руская, замежная). Серыі кніг, якія прызначаны для дзіцячага чытання.

Пашырэнне чытацкага кругагляду з дапамогай гістарычных аповесцей і апавяданняў, аўтабіяграфічнай, дакументальнай, нарысавай літаратуры, прыгодніцкай дзіцячай кнігі, кніг пра культуру і мастацтва.

Знаёмства з серыяй кніг «Дзецям пра мастацтва», «Бібліятэка прыгод», «Маленькая гістарычная бібліятэка», «Бібліятэка сусветнай літаратуры для дзяцей».

Тыпы дзіцячых кніг для пазакласнага чытання: кніга-твор; кніга-зборнік (аўтарскі або тэматычны); хрэстаматыя; збор сачыненняў дзіцячага пісьменніка; кніга-даведнік; дзіцячая энцыклапедыя; школьны тлумачальны слоўнік.

Жанры: легенды, літаратурныя казкі, апавяданні (мастацкія, навукова-мастацкія, навукова-пазнавальныя), аповесці (гістарычныя, аўтабіяграфічныя пра дзяцінства), аповесці-казкі, вершы, байкі.

## ФАРМІРАВАННЕ САМАСТОЙНАЙ ЧЫТАЦКАЙ
## ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Навучэнцы вучацца:

выбіраць кнігі для чытання ў адпаведнасці з пастаўленай мэтай, карыстаючыся відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі (кніжнай выставай, рэкамендацыйнымі спісамі і паказчыкамі, каталогам ці адкрытым доступам да кніжных паліц);

вызначаць прыкладны змест новай кнігі па інфармацыі на вокладцы, тытульным лісце, па ілюстрацыях;

самастойна асэнсоўваць прачытанае: ацэньваць паводзіны і ўчынкі герояў, вызначаць асабістае стаўленне да падзей, учынкаў, герояў;

арыентавацца ў структуры дзіцячай кнігі-даведніка, энцыклапедыі;

звяртацца да даведачнай літаратуры з мэтай адбору патрэбнай інфармацыі да ўрока, выступлення;

разглядаць і чытаць дзіцячыя часопісы і газеты;

працаваць у бібліятэцы (школьнай, раённай), карыстацца паслугамі чытальнай залы.

## АСНОЎНЫЯ ВЕДЫ І ЎМЕННІ

Навучэнцы замацоўваюць правілы паводзін у бібліятэцы (школьнай, раённай, гарадской) і яе чытальнай зале.

Авалодваюць новымі тэрмінамі: «перыёдыка», «журналіст», «рэдактар».

Навучэнцы вучацца:

самастойна рабіць падбор кніг пэўнага аўтара або на зададзеную педагагічным работнікам тэму;

самастойна знаёміцца з новай кнігай да чытання: разглядваць яе з мэтай арыенціроўкі ў змесце і па ілюстрацыях, назве, прозвішчы аўтара, змесце, прадмове, або ўводзінах, пасляслоўі аб аўтары (калі яны ёсць у кнізе);

самастойна знаёміцца з дзіцячым часопісам або газетай;

вызначаць тэму чытання і жанр;

вызначаць тэму творчасці пісьменніка па яго кнігах;

выбіраць звесткі пра пісьменніка з дапамогай інфармацыі з прадмовы і пасляслоўя да яго кніг, даведачнай літаратуры, крыніц глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт;

карыстацца дзіцячай даведачнай літаратурай (кнігі-даведнікі, дзіцячыя энцыклапедыі, школьныя слоўнікі), а таксама матэрыяламі перыядычнага друку;

выконваць правілы работы ў бібліятэцы і яе чытальнай зале.

## ІНДЫВІДУАЛЬНАЯ І ГРУПАВАЯ РАБОТА З КНІГАЙ У ПАЗАЎРОЧНЫ ЧАС

Наведванне бібліятэкі, работа ў чытальнай зале з даведачнай літаратурай, дзіцячымі часопісамі і газетамі.

Праца ў «майстэрні па рамонце кніг».

Падрыхтоўка і ўдзел у літаратурных ранішніках, віктарынах, конкурсах.

## СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

Н. Гілевіч. «Я – беларус».

В. Жуковіч. «Першая настаўніца».

У. Карызна. «Люблю цябе, Белая Русь».
Якуб Колас. «Усход сонца».

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ IV КЛАСА

Ведаць:

прозвішчы аўтараў, з творчасцю якіх неаднойчы знаёміліся на вучэбных занятках па літаратурным чытанні, і іх творы (назва, імёны герояў, асноўны змест);

творы, рэкамендаваныя для завучвання на памяць;

назвы элементаў кнігі: вокладка, пераплёт, карашок, старонка, тытульны ліст, змест, прадмова, ілюстрацыя.

Мець уяўленне пра:

жанр фальклору «легенда» і яе асаблівасці;

жанры аўтарскай літаратуры (літаратурная казка, апавяданне, байка, аповесць-казка, верш) і іх асаблівасці;

выяўленча-вобразныя сродкі мастацкага маўлення (параўнанне, адушаўленне, эпітэт, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы);

навукова-пазнавальныя творы.

Умець:

чытаць правільна, усвядомлена і выразна ўслых тэксты розных відаў (мастацкі, навукова-пазнавальны, вучэбны) у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення і ў тэмпе, які не перашкаджае разуменню прачытанага;

чытаць усвядомлена пра сябе (моўчкі) тэксты розных відаў;

самастойна вызначаць задачу выразнага чытання і чытаць выразна падрыхтаваныя тэксты;

ацэньваць сваё і чужое чытанне з пазіцый правільнасці і выразнасці;

вызначаць вучэбную задачу чытання: што, з якой мэтай павінны прачытаць;

планаваць дзейнасць: называць у паслядоўнасці дзеянні пры падрыхтоўцы да складання плана, сціслага пераказу, інсцэніроўкі;

кантраляваць і ацэньваць вучэбныя дзеянні ў адпаведнасці з пастаўленай задачай і яе вынікам;

самастойна знаёміцца з творам і кнігай да чытання;

прагназаваць перад чытаннем змест і характар мастацкага твора (кнігі) па ілюстрацыях і загалоўку;

самастойна вызначаць тэму і галоўную думку твора;

самастойна знаходзіць у тэксце словы, якія ўказваюць на эмацыянальны настрой героя, яго пачуцці, адносіны аўтара да адлюстраваных з'яў;

характарызаваць героя на падставе яго паводзін, перажыванняў і ўчынкаў, выказваць свае адносіны да яго;

выяўляць аўтарскія адносіны і выказваць свае меркаванні пра падзеі, учынкі герояў; даваць сваю ацэнку ўчынку, герою;

складаць план твора і карыстацца ім падчас пераказу; падрабязна, выбарачна і сцісла пераказваць сюжэт твора;

вызначаць у тэксце твора выразныя сродкі мастацкага маўлення (параўнанне, адушаўленне, эпітэт, перабольшанне) і ўстанаўліваць іх функцыі, вызначаць рыфму і яе ўласцівасці;

вылучаць з навукова-пазнавальнага тэксту факты, дакладныя звесткі, знаходзіць апісанне прадмета, факта, ацэньваць інфармацыю (дзе можна выкарыстаць гэтыя веды);

ствараць слоўныя і графічныя ілюстрацыі па змесце твора;

арыентавацца ў літаратурных тэрмінах: фальклор, вусная народная творчасць, жанр, мастацкі твор, навукова-пазнавальны тэкст, аўтар (пісьменнік, празаік, паэт), эпізод, тэма, асноўная думка, герой (персанаж), адушаўленне, параўнанне, эпітэт, перабольшанне, эмацыянальна-ацэначныя словы, рыфма; ужываць іх да месца пры адказе на пытанне;

прыводзіць прыклады легенд, песень, казак (народных і літаратурных), вершаў, апавяданняў, казачных аповесцей, навукова-пазнавальных тэкстаў з кола вывучаных твораў;

валодаць прыёмамі завучвання вершаў (з апорай на ключавыя словы і ўяўляемыя карціны);

працаваць у групе, ствараючы інсцэніроўкі нескладаных сюжэтных твораў;

крытычна ацэньваць дзіцячыя творчыя работы падчас абмеркавання;

арыентавацца ў дзіцячых кнігах, выкарыстоўваючы пры гэтым адпаведныя элементы кнігі, а таксама бібліяграфічную дапамогу;

самастойна выконваць падбор кніг пэўнага аўтара або на зададзеную педагагічным работнікам тэму;

карыстацца даведачнай літаратурай, а таксама матэрыяламі перыядычнага друку.

Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці:

ажыццяўляць выбар кніг з дапамогай рэкамендацыйнага спісу, адкрытага доступу да дзіцячых кніг у бібліятэцы;

самастойна чытаць кнігі, дзіцячую перыёдыку;

карыстацца ўсімі відамі бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогі;

самастойна знаёміцца з творамі і кнігай да чытання;

арыентавацца ў кнігах па змесце;

выказваць ацэначныя погляды аб прачытаным творы (героі, падзеі), кнізе, прагледжаным фільме, спектаклі;

карыстацца тлумачальным слоўнікам;

карыстацца энцыклапедычным тэкстам для атрымання фактычных даных;

прымаць удзел у літаратурных конкурсах.